**Установа адукацыі**
**«БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ОРДЭНАЎ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ І ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЯ АКАДЭМІЯ»**

**Аддзел па выхаваўчай працы з моладдзю**

**Музей УА БДСГА**

# ЭТНАГРАФІЧНЫ МАРАФОН «НАМ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА»

(*прысвечаны Году народнага адзінства, у рамках міжнароднай акцыі* «*Ноч музеяў*» *сярод студэнтаў Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі*)

Для ўдзельнікаў выхаваўчага працэсу

Горкі
БДСГА
2021

**Аўтары-распрацоўшчыкі:**
*Лосева Тацццяна Уладзіміраўна,* загадчык музея УА БДСГА
*Макеева Святлана Міхайлаўна,* дырэктар ДУК «Горацкі раённы гісторыка-этнаграфічны музей»

Этнаграфічны марафон «Нам засталася спадчына»/ аўтары-склад.: Т.В. Лосева, С.М. Макеева, – Горкі ; БДСГА, 2021. – 61 с.

Дадзенае мерапрыемства прысвечана Году народнага адзінства і накіравана на развіццё патрыятызму і актыўнай грамадзянскай пазіцыі студэнцкай моладзі, паглыбленне ведаў студэнтаў пра беларускія народныя традыцыі, святы і абрады, выхаванне павагі да гістарычнага мінулага Беларусі, далучэнне моладзі да краязнаўчай і пошукава-даследчай работы, захаванне гістарычнай памяці беларускага народа, яго нацыянальна-культурнай самасвядомасці.
Для ўдзельнікаў выхаваўчага працэсу

© УА «Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія», 2021

**ЗМЕСТ**

Уводзіны………………………………………………………………………….…. 4
Сцэнарый правядзення этнаграфічнага марафона “Нам засталася спадчына”, прысвечанага Году народнага адзінства, у рамках міжнароднай акцыі “Ноч музеяў”сярод студэнтаў Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі…………………………………………………………………………… 6
Заключэнне……………………………………………………………………….. 19
Літаратура………………………………………………………………………… 20
Дадатак……………………………………………………………………………. 21

# УВОДЗІНЫ

1 студзеня 2021 года Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка падпісаў Указ № 1, згодна якому ў мэтах кансалідацыі грамадства, згуртавання беларускага народа на аснове ідэй суверэнітэту і незалежнасці краіны 2021 год у Беларусі абвешчаны Годам народнага адзінства.

Згуртаванасць і згода, талерантнасць і ўзаемаразуменне, павага адзін да аднаго – каштоўнасці, да якіх імкнецца кожны чалавек незалежна ад палітычных поглядаў. Для таго, каб лічыцца грамадзянінам і патрыётам сваёй краіны, трэба ведаць гісторыка-культурную, этнаграфічна-фальклорную і духоўную спадчыну Радзімы.

Сёння задача патрыятычнага выхавання моладзі актуальна тым, што сучасная моладзь мала ведае пра гісторыю, культурныя традыцыі свайго народа. Каб чалавек сапраўды паважаў памяць продкаў, любіў сваю краіну, адчуваў адказнасць за Радзіму, яго трэба такім выхаваць. Заклікамі любіць свой горад, Радзіму нічога не зробіш. Цяпер, у перыяд нестабільнасці ў грамадстве, узнікае патрэба вярнуцца да лепшых традыцый нашага народа, да яго стогадовых каранёў.

Пачуццё патрыятызму шматграннае па сваім змесце. Гэта і любоў да родных месцаў, роднай мовы, нацыянальнай культуры і гісторыі краіны. Патрыятызм – гэта і гонар за свой народ, яго гераічнае мінулае, яго дасягненні ў мірны час, і жаданне захаваць, памножыць духоўнае і матэрыяльнае багацце сваёй краіны. Быць патрыётам – значыць адчуваць сябе неад’емнай часткай Бацькаўшчыны.

Маладое пакаленне павінна разумець, што яно з'яўляецца часткай народа адной краіны, што яны – грамадзяне Беларусі.

Роля музеяў у патрыятычным выхаванні моладзі неаспрэчная. Абапіраючыся на свае ўнікальныя магчымасці захоўвання і дэманстрацыі рарытэтаў, што змяшчаюць першасную інфармацыю па айчыннай гісторыі, традыцыях і культуры, музей здольны дапамагчы ў справе фарміравання грамадзяніна і патрыёта.

Вялікае значэнне ў патрыятычным выхаванні мае актыўная разнастайная дзейнасць музеяў. Для гэтага яны выкарыстоўваюць розныя формы музейнай працы: экскурсіі, музейныя заняткі, святы, тэматычныя вечары, віктарыны, квізы і квэст-гульні, якія набіраюць усё большую папулярнасць сярод моладзі. Кожная форма музейнай работы ўяўляе сабой арыгінальную праграму перадачы праз экспанаты пэўных ведаў, навыкаў, меркаванняў, ацэнак і пачуццяў.

У 2021 годзе музей установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная ордэнаў Кастрычніцкай Рэвалюцыі і Працоўнага Чырвонага Сцяга

сельскагаспадарчая акадэмія» і Горацкі раённы гісторыка-этнаграфічны музей аб’ядналі свае намаганні для арганізацыі і правядзення этнаграфічнага марафона «Нам засталася спадчына», прысвечанага Году народнага адзінства (далей Марафон).

**Мэта этнаграфічнага марафону:** развіццё патрыятызму і актыўнай грамадзянскай пазіцыі ў студэнцкай моладзі.

**Задачы:**

- паглыбіць веды студэнтаў пра матэрыяльную спадчыну беларусаў, народныя традыцыі, святы і абрады;
- далучыць моладзь да краязнаўчай і пошукава-даследчай работы;
- развіць творчыя здольнасці, садзейнічаць набыццю камунікатыўных навыкаў праз далучэнне да сучасных форм музейнай дзейнасці;
- захаваць гістарычную памяць беларускага народа, яго нацыянальна-культурную самасвядомасць;
- папулярызаваць гісторыка-культурную спадчыну Горацкага краю;
- выхаваць у студэнтаў павагу да гістарычнага мінулага Беларусі, грамадзянскую адказнасць за будучыню гісторыка-культурнай спадчыны.

Марафон быў праведзены ў рамках міжнароднай акцыі «Ноч музеяў» сярод студэнтаў Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі.

Пры правядзенні Марафона арганізатары выкарысталі як ужо вядомыя формы работы, так і новы інтэрактыўны метад quiz (квіз) – гэта інтэрактыўная форма гульні, у час якой гульцы па камандах ці індывідуальна спаборнічаюць у адказах на пытанні па зададзенай тэматыцы. Пры рабоце з дадзеным метадам прадугледжваецца выкарыстанне мабільнага абсталявання з доступам у інтэрнэт (смартфона, планшэта).

У квізе удзельнічала 9 каманд па 5 чалавек у кожнай. Каманды на працягу 18 тураў спаборнічалі ў адказах на пытанні, прысвечаныя матэрыяльнай і духоўнай культуре беларусаў.

Дадзеная інтэрактыўная форма работы музея патрабавала ад гульцоў увагі, засяроджанасці, умення слухаць і здольнасці да работы ў камандзе. Квіз дазволіў удзельнікам акунуцца ў прыемную атмасферу інтэлектуальных гульняў, прадэманстраваць свае веды і праверыць сваю інтуіцыю.

Квіз-гульня разглядаецца як перспектыўная форма культурна-адукацыйнай дзейнасці музея ў сучасных умовах і адзін з эфектыўных спосабаў прыцягнення ўвагі маладзёжнай аўдыторыі к гісторыі і культурнай спадчыне беларусаў.

## СЦЭНАРЫЙ
### правядзення этнаграфічнага марафона “Нам засталася спадчына”, прысвечанага Году народнага адзінства, у рамках міжнароднай акцыі “Ноч музеяў” сярод студэнтаў Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі

**Мэта і задачы:**

-развіццё патрыятызму і актыўнай грамадзянскай пазіцыі студэнцкай моладзі;

-паглыбленне ведаў студэнтаў пра беларускія народныя традыцыі, святы і абрады, выхаванне павагі да гістарычнага мінулага Беларусі;

-далучэнне моладзі да краязнаўчай і пошукава-даследчай работы;

-захаванне гістарычнай памяці беларускага народа, яго нацыянальна-культурнай самасвядомасці.

**Форма правядзення:** этнаграфічны марафон.

**Мерапрыемста праводзяць:** музей УА БДСГА, ДУК “Горацкі раённы гісторыка-этнаграфічны музей”.

**Аўдыторыя:** студэнты факультэтаў вочнай формы адукацыі УА БДСГА. Склад каманд – 5 чалавек. Усяго каманд – 9.

**Месца правядзення:** Цэнтр студэнцкай мастацкай творчасці УА БДСГА.

**Час правядзення:** 18 мая 2021 г.; 16.00 – 21.00 г.

**Абсталяванне:** мультымедыя, мікрафоны, калонкі, мабільныя тэлефоны з доступам у інтэрнэт.

**Афармленне:** на імправізаванай сцэне усталяваны мультымедыйны экран, на якім адлюстравана прэзентацыя з назвай мерапрыемства *(Дадатак 10)*, аформлена выстава з прадметамі матэрыяльнай культуры беларусаў з фондаў музея УА БДСГА і ДУК “Горацкі раённы гісторыка-этнаграфічны музей”.

**Музычнае суправаджэнне:** беларуская народная музыка.

### Ход мерапрыемства

Гучыць верш Я.Купалы “Спадчына”. Чытае Кацярына Чорная *(на экране прэзентацыя з краявідамі Беларусі).*

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.

Аб ёй мне баюць казкі-сны
Вясеннія праталіны,
І лесу шэлест верасны,
І ў полі дуб апалены.

Аб ёй мне будзіць успамін
На ліпе бусел клёкатам
І той стары амшалы тын,
Што лёг ля вёсак покатам;

Жыве з ім дум маіх сям'я
І сніць з ім сны нязводныя…
Завецца ж спадчына мая
Ўсяго Старонкай Роднаю.

**Вядучая** Добры вечар, паважаныя сябры, удзельнікі этнаграфічнага марафона, а таксама іх балельшчыкі.

**Вядучы:** Вечар добры!

**Вядучая:** Вось, нарэшце, і прыйшоў гэты доўгачаканы дзень, Міжнародны дзень музеяў.

**Вядучы:** І што ж гэта за дзень такі?

**Вядучая:** Гэты дзень святкуецца ва ўсім свеце 18 мая з 1977 года. Ён быў заснаваны на 11-ым Міжнародным злёце музеяў, які адбыўся ў Маскве і Ленінградзе. Музейнай супольнасці захацелася стварыць асаблівую падзею, якой і стаў Міжнародны дзень музеяў.

**Вядучы:** Штогод падзея робіцца ўсё больш і больш папулярнай. У гэтай акцыі сёння бяруць удзел дзясяткі тысяч музеяў па ўсім свеце.

І кожны з іх хоча адсвяткаваць яго неяк па-асабліваму. Так, прыкладам, упершыню ў 1997 г. у Берліне ў рамках святкавання Міжнароднага дня музеяў была праведзена «Ноч музеяў».

**Вядучая:** У гэтую ноч шмат якія музеі адкрыты для наведвальнікаў пасля заходу сонца і амаль да раніцы. Асноўная мэта акцыі – паказаць рэсурс, магчымасці, патэнцыял сучасных музеяў, прыцягнуць у іх моладзь.

Сёлета музеі нашага горада аб’ядналі свае намаганні, каб правесці Ноч музеяў у незвычайным фармаце. Мы вырашылі зрабіць этнаграфічны марафон пад назвай “Нам засталася спадчына”, які прысвечаны Году народнага адзінства *(Дадатак 3)*.

**Вядучы:** Кожны з вас прыехаў ў Горкі з розных куткоў нашай краіны, у якіх існуюць свае абрады і традыцыі.

**Вядучая:** У кожным рэгіёне есць свае помнікі гісторыі і культуры, сваё гістарычнае мінулае.

**Вядучы:** Але ж у нас і шмат агульнага, таго, што нас аб’ядноўвае. Па-першае, усіх вас, студэнтаў, аб’яднала Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія.

**Вядучая:** Па-другое, усіх нас разам аб’ядноўвае наша краіна, наша Радзіма, якая завецца Беларусь.

***Муз. І.Цвяткова, сл. Некляева. “Бераг белых буслоў”***
***Выконвае*** ______________________________________________

**Вядучы:** Сёння мы рады бачыць на нашым свяце студэнцкую моладзь, якая з'ядналася ў каманды для таго, каб паўдзельнічаць у этнаграфічным марафоне.

**Вядучая:** Вельмі радуе тое, што ў гэты святочны вечар вы з намі. Мы шчыра спадзяёмся, што марафон прынясе вам шмат станоўчых эмоцый.

**Вядучы:** І так, пачынаем!!!!

***Гучыць музыка, у залу ўваходзяць члены краязнаўчага клуба “Кліа” апранутыя ў традыцыйныя беларускія касцюмы, якія былі сабраныя пад час этнаграфічных экспедыцый па Горацкаму раёну.***

1. **“Мода з бабулінага куфэрка”.**

**Вядучы**: Чым беларуска прываблівала мужчын? Зараз чалавецтва выдумляе ўсё новыя і новыя формы ідэнтыфікацыйнага пасведчання грамадзян – ледзь не па аналізу ДНК… А ўсяго стагоддзе таму ў кожнага беларуса быў “дакумент”, які без цяжкасцей мог “прачытаць” кожны, хто стаяў побач. З гэтага “пашпарта” можна было даведацца, напрыклад, з якой мясцовасці або вёскі прыехала на кірмаш жанчына, ці замужам яна, ці мае дзетак, колькі прыкладна гадоў пражыла на свеце. Такім пасведчаннем, як вы ўжо здагадаліся, была вопратка.

Сёння мы прадстаўляем вашай увазе беларускія народныя строі, якія насілі нашы бабулі і дзядулі.

*(паказ мод з этнаграфічнымі прадметамі ў руках пад фанаграму з апісаннем народных касцюмаў).*

*Традыцыйны народны касцюм на Беларусі мае свае лакальныя асаблівасці. Колер і крой адзення, вышыўка, тканы арнамент у розных мясцовасцях значна адрозніваюцца. Для нашага рэгіёны характэрны так званы “магілёўскі строй”.*

*У буднія дні жанчыны насілі палатняную спадніцу – бяляк. Яна магла быць гладка-белай ці клятчатай, шэра-белай з арнаментаваным шляхам на падоле. Святочным паясным адзеннем быў андарак. Звычайна яго шылі з чырвона-малінавага сукна з белай, зялёнай, сіняй, чорнай клеткай. Падпярэзвалі андарак вузкім тканым поясам. Паверх спадніцы надзявалі фартух. Яго шылі з трох полак белага палатна. Падол святочнага фартуха затыкалі чырвоным колерам ці вышывалі чырвонымі і чорнымі ніткамі. Знізу да яго прышывалі звязаныя кручком карункі.*

*Паверх кашулі адзявалі гарсэт з сіняга ці чырвонага аксаміту, паркалю, саціну, шарсцянкі. Унізе ён меў баску ў выглядзе клінкоў. Зашпільваўся гарсэт на гаплікі пасярэдзіне альбо з левага боку грудзей. Уздоўж засцёжкі, на праймах рукавоў і па выразе нашывалі тасьму ці стужкі. Безрукаўку маглі прышываць да спадніцы. У гэтым выпадку яна насіла назву кабат.*

*Галаўным уборам замужніх жанчын былі чапец і намітка. Яе ткалі з кужэльнага палатна ў выглядзе доўгага (да 3.5 м) ручніка. Шырыня наміткі звычайна складала 0,5 м. Канцы яе ўпрыгожваліся тканым ці вышываным геаметрычным арнаментам.*

*У другой палове XIX стагоддзя намітку ўсё часцей замяняе даматканая хустка. На пачатку XX стагоддзя наміткі насілі толькі старыя жанчыны. У гэты час знікае і чапец. Замест яго пад вялікую хустку павязвалі меньшую, якая шчыльна прылягала да галавы.*

*Дзяўчаты з дзесяцігадовага ўзросту пачыналі насіць вянкі. Летам іх плялі з жывых кветак, у астатні час рабілі з цвердага матэрыялу: палоскі бераcты ці лубу шырынёй 10-15 см абшывалі палатном. Вясельны вянок упрыгожвалі стужкамі.*

*Дапаўнялі жаносы касцюм пацеркі, крыжыкі, завушніцы і пярсцёнкі.*

*У мужчынскі касцюм уваходзілі кашуля і нагавіцы. Часам ён дапаўняўся суконнай ці палатнянай безрукаўкай, якая зашпільвалася на гузікі. Кашулі шылі тунікападобныя, з адкладным ці стаячым каўнярам. Манішка святочных кашуль багата вышывалася.*

*Летам мужчыны насілі белыя палатняныя нагавіцы. Зімой апраналі суконнікі карычневага ці чорнага колеру. У летнюю пару іх адзявалі толькі на святы і шылі з больш тонкага сукна.*

*Абавязковай прыналежнасцю мужчынскага касцюма быў пояс. Распаўсюджаны былі паясы тканыя на бёрдзечку і плеценыя на дошчачках. Паясы, якімі падпярэзвалі верхнюю вопратку,упрыгожвалі кутасамі.*

*Мужчынскімі галаўнымі ўборамі служылі магеркі і цёплыя шапкі з*

*чорнага опушка.*

*У халодную пару года і мужчыны, і жанчыны насілі світкі і кажухі. Світкі шылі з хатняга сукна ці паўсукна белага колеру. Восенню іх насілі асобна, а зімой надзявалі паверх кажуха, каб ён не сапсаваўся ад вільгаці і не так моцна пэцкаўся.*

*Традыцыйны народны касцюм дапаўняўся абуткам. Асноўным відамі яго з'яўляліся лапці. Іх плялі с ліпавага ці лазовага лыка з глыбокім закрытым наском. Гэта так званыя* ***слепакі*** *ці* ***глухія лапці****. Распаўсюджанымі былі і неглыбокія, амаль адна падэшва,* ***лапці-шчарбакі, ці бяспятнікі,*** *якія насілі пераважна летам на палявых работах. Летам лапці адзявалі на палатняныя анучы, зімой – на суконныя.*

*У XIX стагоддзі павысіўся попыт на скураны абутак: боты і чаравікі. Яны перадаваліся ў спадчыну. Абувалі іх у асноўным на святы і ў царкву. Часам на ўсю веску была адна пара скуранога абутку, які пазычалі на вянчанне.*

**Вядучая:** Строі, якія вы сёння бачылі, сабраныя пад час этнаграфічных экспедыцый па Горацкаму раёну членамі краязнаўчага клуба "Кліа" і супрацоўнікамі Горацкага раённага гісторыка-этнаграфічнага музея.

*Прывітанне арганізатараў і удзельнікаў этнаграфічнага марафона, прадстаўленне каманд, абвяшчэнне парадку і ўмоў правядзення марафона*

**Вядучы:** Арганізатарамі нашага мерапрыемства з'яўляюцца**:** музей акадэміі, Горацкі раённы гісторыка-этнаграфічны музей, краязнаўчы клуб "Кліа". Работа вялася пад агульным кіраўніцтвам рэктарата акадэміі, аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Горацкага райвыканкама, упраўлення па выхаваўчай рабоце сельскагаспадарчай акадэміі з удзелам прафсаюзнага камітэта студэнтаў БДСГА, Горацкай раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі", супрацоўнікаў цэнтра студэнцкай мастацкай творчасці акадэміі, Горацкага раённага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

**Вядучая:** Для ўдзелу ў марафоне падалі заяўкі *(Дадатак 4)* дзевяць каманд. Кожная з іх мае сваю назву:

**Вядучы:** каманда агранамічнага факультэта ____________________

**Вядучая:** каманда аграэкалагічнага факультэта _________________

**Вядучы:** каманда факультэта бізнеса і права____________________

**Вядучая:** каманда факультэта бухгалтарскага ўліку______________

**Вядучы:** каманда землеўпарадкавальнага факультэта_____________

**Вядучая:** каманда факультэта біятэхналогіі і аквакультуры _______

**Вядучы:** каманда меліярацыйна-будаўнічага факультэта _________

**Вядучая:** каманда факультэта механізацыі сельскай гаспадаркі_____

**Вядучы:** каманда эканамічнага факультэта ____________________

**Вядучая:** Наш марафон будзе праходзіць у некалькі этапаў:

-**“Этнаграфічны квіз**”;
-**“Бяспройгрышная латарэя”**;
-**“Выцінанку выцінаю…”**
-**“Медыя-азбука”;**
-**“Танцавальны марафон”;**
-**“Народныя забавы”;**
-**“Песенныя традыцыі”.**

**Вядучы:** Падвядзенне вынікаў здзяйсняецца журы ў дзень правядзення марафона *(Дадаткі 5,6).* Пераможцам лічыцца каманда, якая атрымала найбольшую колькасць балаў у этнаграфічным марафоне. Пры роўнай колькасці балаў пераможцай лічыцца каманда, якая перамагла ў “Этнаграфічным квізе”. Каманда-пераможца этнаграфічнага марафона ўзнагароджваецца дыпломам і прызамі. Каманды-удзельніцы ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел і агульнакамандным прызам *(Дадаткі 11,12).*

Крытэрыі вызначэння пераможцаў марафона:

1. правільнае выкананне ўсіх заданняў;.
2. вытрымліванне рэгламенту адведзенага часу;
3. карэктныя паводзіны ў адносінах да сапернікаў.

**Вядучая:** Журыць марафон будуць:

**Старшыня** – Веліканаў Віталій Віктаравіч, рэктар акадэміі;

**Намеснік старшыні** – Патапенка Максім Валянцінавіч, прарэктар па выхаваўчай рабоце акадэміі, старшыня раённай арганізацыі «Белая Русь»;

**Члены журы:**

Бандык Марына Аляксандраўна, першы сакратар РК БРСМ;

Лосева Таццяна Уладзіміраўна, загадчык музея акадэміі, кіраўнік краязнаўчага клуба “Кліа”;

Макеева Святлана Міхайлаўна, дырэктар Горацкага раённага гісторыка-этнаграфічнага музея”;

Сідзюк Віталій Мікалаевіч, старшыня прафкома студэнтаў акадэміі;

Караеўская Таццяна Аляксандраўна, старшы навуковы супрацоўнік Горацкага раённага гісторыка-этнаграфічнага музея;

Бруй Алена Яўгеньеўна, настаўнік Дзіцячай школы мастацтваў і мастацкіх рамёстваў г. Горкі;

Сталярова Вікторыя, студэнтка 2 к. 5 гр., эканамічнага факультэта УА БДСГА, член краязнаўчага клуба "Кліа";

Чорная Кацярына, студэнтка 2 к. 5 гр., эканамічнага факультэта УА БДСГА член краязнаўчага клуба "Кліа";

Козел Дар'я, студэнтка 2 к. 7 гр., факультэта бухгалтарскага ўліку УА БДСГА, член краязнаўчага клуба "Кліа".

Права адкрыць этнаграфічны марафон прадастаўляецца рэктару акадэміі Віталію Віктаравічу Веліканаву.

**Вядучы:** наш першы конкурс **"Этнаграфічны квіз"** *(Дадатак 8).*

Квіз (ад анг. quiz) – гэта інтэрактыўная гульня, якая праходзіць у выглядзе віктарыны ці квэста, падчас яе адзін ці мноства карыстачоў адказваюць на задаваныя пытанні.

**Вядучая:** Спадзяёмся, вы усе зарэгістраваліся на сайце МАЙКВІЗ. Зараз мы адкрываем гульню, а вы павінны перайсці па ссылцы, якую атрымалі ўчора.

Усе перайшлі? На кожнае пытанне даецца 1 хвіліна. Вы павінны адзначыць свой варыянт адказу і націснуць кнопку "Ответить". Будзьце уважлівы, на некаторыя патынні трэба напісаць слова-адказ на беларускай мове і таксама націснуць кнопку "Ответить".

**Вядучы:** За кожны правільны адказ даецца 1 бал. Пачынаем гульню!

Падвядзенне вынікаў. У этнаграфічным квізе перамагла каманда______________

**Вядучая:** Каб падняць настрой удзельнікаў, абвяшчаецца бяспроігрышная латарэя *(Дадатак 9).* Прыз атрымлівае каманда, якая першая дасць правільны адказ. Вы павінны даслухаць пытанне да канца, а потым падняць руку.

### Пытанні для латарэі

1. **Вядучы:** Якая абрадавая страва заўсёды была на вясельным стале славян?

Адказ: **каравай**

2. **Вядучая:** З якой абраднасцю ў сямейна-бытавым календары славян злучана свята Радаўніца?

Адказ: **пахавальна-памінальная**

3. **Вядучы:** Як называлася хата, якая тапілася печчу без дымахода. Дым выходзіў праз дзверы ці спецыяльныя адтуліны ў сценах?

Адказ: **курная хата (чорная хата)**

4. **Вядучая:** У павер'ях усходніх славян яна асацыюецца з птушкай-прадказальніцай, а таксама як знак адзіноты, няшчаснай жаночай долі. Пра якую птушку ідзе гаворка?

Адказ: **зязюля**

5. **Вядучы:** Лялечны тэатр беларусаў называўся …

Адказ: **батлейка**

6. **Вядучая:** Самае ганаровае месца ў хаце ва ўсходніх славян. Згодна традыцыйнаму этыкету чалавек, які зайшоў у хату, мог прайсці туды толькі з дазволу гаспадара.

Адказ: **чырвоны кут**

7. **Вядучы:**Традыцыйны жаночы галаўны ўбор усходніх славян. На Беларусі яе насілі замужнія жанчыны.

Адказ: **намітка**

8. **Вядучая:** Сацыяльнае ўтварэнне, заснаванае на шлюбе і крэўным сваяцтве людзей, якія злучаны агульным побытам, узаемнай праўнай і маральнай адказнасцю?

Адказ: **сям’я**

9. **Вядучы:** Форма ўзаемадапамогі ў славян, якую арганізоўвалі ў вёсцы для выканання тэрміновых і грамадскіх прац: збудаванне хат, цэркваў і да т. п. Аднавяскоўцы працавалі разам, самахоць і задарма.

Адказ: **талака**

**Вядучы:** Вельмі добра, дзякуем за такія вясёлыя адказы.

**Вядучая**: З танюткай чырвонай і сіняй паперы
Дзівосныя ўзоры на вокны, на дзверы.
І свецяцца ўзімку, і свецяцца ўранку
На сценах, як сонечны сон, выцінанкі.

**Вядучы:** Наступны этап нашага этнаграфічнага марафону называецца **“Выцінанку выцінаю”.**

Калі запытацца ў звычайнага чалавека, што такое выцінанка, то ў адказ, хутчэй за ўсё, пачуеш маўчанне. І сапраўды, хіба што спецыялісты

ды найбольш дасведчаныя прыхільнікі народнай творчасці змогуць адказаць на пытанне. А, між іншым, многія з вас у сваім дзяцінстве займаліся гэтай самай выцінанкай. Адбывалася ўсё падчас, калі надыходзілі Каляды і Новы год, самыя чароўныя і любімыя святы дарослых і дзяцей. Бралі ў рукі паперу і нажніцы і пачынаўся цуд…

**Вядучая:** Дык што, сняжынкі – гэта і ёсць тыя самыя выцінанкі.

**Вядучы:** Так. Калі заглянуць ў этнаграфічны слоўнік, мы даведаемся, што выцінанка – гэты ажурны ўзор, выразаны з белай альбо каляровай паперы.

**Вядучая:** Выцінанка вядома з даўніх часоў, але ў цяперашні час яна перажывае другое нараджэнне. У нашым горадзе таксама ёсць людзі, якія захоўваюць традыцыі вырабу беларускай выцінанкі. Сярод іх Бруй Алена Яўгеньеўна, настаўнік дзіцячай школы мастацтваў і мастацкіх раместваў г. Горкі, вядучы майстар Горацкага раёна па выцінанцы.

Прадастаўляем слова выкладчыку Алене Яўгеньеўне Бруй.

**Вядучы:** Зараз запрашаем па аднаму прадстаўніку ад каманды для ўдзелу ў конкурсе “Выцінанку выцінаю…”. Сядайце, калі ласка, за стол. Для вас падрыхтаваны каляровая папера і нажніцы.

Паважаная Алена Яўгеньеўна, просім Вас правесці майстар-клас для нашых марафонцаў.

**Вядучая:** Паважаныя удзельнікі конкурсу, уважліва сачыце за дзеяннямі майстра, бо вам самім трэба будзе паўтарыць выцінанку. Па выніках конкурсу Алена Яўгеньеўна вызначыць трох пераможцаў. Каманда, якая займе 1 месца, атрымае 3 балы, за 2 месца – 2 балы, за 3 месца – 1 бал.

*(Праводзіцца майстар-клас, удзельнікі паўтараюць за майстрам, затым майстар ацэньвае работы).*

**Вядучы:** Наступны этап нашага марафону называецца **“Медыяазбука”** *(Дадаткі 7,7.1).*

Зараз на экране будуць прадстаўлены слайды з літарамі і выявамі прадметаў беларускага быта. Кожная каманда атрымае ліст з табліцай, у якой змешчаны літары беларускага алфавіту. Вы павінны насупраць кожнай літары напісаць назву прадмета, які бачыце на экране. На кожную выяву адводзіцца 5 секунд.

Напрыклад: А – абрус

**Вядучая:** За кожны правільны адказ даецца 1 бал.

У конкурсе **“Медыяазбука”** перамагла каманда _______________

**Вядучы**: Напэўна, усе засядзеліся, хочацца крыху парухацца і патанчыць. Абвяшчаю наступны этап – **“Танцавальны марафон”.**

**Вядучая:**Народныя танцы з’яўляюцца неад’емнай часткай беларускай культуры. Кожная значная падзея ў жыцці беларуса суправаджалася танцамі, ні адно свята не магло абыйсціся без іх. У танцы, у мастацкім вобразе праяўляецца пачуццё прыгажосці жыцця, узнёсласць, тэмперамент, характар і асноўныя рысы народа.

**Вядучы:** Можа хто з вас ведае, якія танцы былі моднымі на пачатку ХХ ст. (адказы). Нашы бабулі танчылі такія танцы як “У суботу”, “Падэспань”, “Кракавяк”.

**Вядучая:** У апошнія гады XIX стагоддзі Расію захліснула мода на новыя салонныя танцы. Яны былі разлічаны на выкананне адной ці некалькімі парамі, што танцуюць па коле ў бальнай зале, і ўяўлялі сабою простыя кампазіцыі, што складаюцца з невялікіх фігур, паслядоўнасць якіх паўтаралася. Схемы гэтых танцаў прывозіліся з-за мяжы, звычайна з Францыі ці Англіі.

**Вядучы:** Аднак у 1898-1899 гадах сталі з'яўляцца і першыя кампазіцыі, складзеныя расійскімі харэографамі. Адным з такіх навамодных танцаў і стаў **Pas d’Espagne**, схема якога была апублікавана ў маскоўскіх і сталічных выданнях практычна адначасова ў 1899г. Гэты танец састаяў з элементаў, характэрных для іспанскага сцэнічнага танца. Менавіта дзякуючы прыгожай, незвычайнай і лёгка запамінальнай музыцы, танец Падэспань у імгненне вока ўвайшоў у моду.

**Вядучая:** Зараз у кола мы запрашаем па два чалавекі ад кожнай каманды, якія будуць спаборнічаць у “Танцавальным марафоне”. А майстар-класс па танцу Падэспань для вас правядуць ўдзельнікі танцавальнага калектыву “Сузор’е” Раённага цэтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Кіраўнік Бобрык Святлана Ўладзіміраўна, акампаніятар – Кавалёў Віталій Іванавіч.

**Вядучы**: Нашыя продкі добра працавалі, але яны умелі і добра і весела адпачываць. Вельмі папулярнымі былі розныя гульні. Наступны этап нашага марафону – **“Народныя забавы”:**

**Вядучая:** Зараз мы прапануем вам прыняць удзел у традыцыйных беларускіх гульнях “Міхасік” і “Пасадка бульбы”.

**Вядучы:** Першая гульня **“Міхасік”.**

**Апісанне:** для правядзення гульні 8 (восем) вянкоў раскладваецца па кругу на стале. Дзевяць удзельнікаў гульні становяцца вакол стала. Гучыць хуткая беларуская народная мелодыя. Удзельнікі пад музыку рухаюцца па кругу. Пасля заканчэння музыкі ўсе спыняюцца і кожны стараецца надзець вянок на галаву. Той, хто застаўся без вянка, выбывае з гульні. Затым убіраецца адзін вянок і гульня працягваецца да тых пор,

пакуль не застанецца адзін гулец. Ён і лічыцца пераможцам. Каманда атрымлівае 1 бал.

**Правіла гульні.**

Гульцы бяруць вяночкі толькі пасля заканчэння музыкі.

**Вядучая:** Наступная гульня **"Пасадка бульбы".**

**Апісанне гульні:** стваращца тры каманды па пять чалавек. Гулец, які стаіць першым, – капітан, ён трымае ў руцэ мяшочак з пяццю бульбінамі. На адлегласці дваццаці крокаў ад кожнай калоны начэрчаны пяць кругоў. Па сігналу капітаны бягуць да кругоў і садзяць бульбу па адной ў кожны круг, затым вяртаюцца і перадаюць мяшочак наступнаму гульцу. Гулец з мяшочкам бяжыць збіраць бульбу і г.д.

**Правілы гульні**.

Капітаны стартуюць па сігналу. Гульцы не выходзяць за лінію без мяшочка. Калі бульба ўпала, яе трэба падняць, а затым бегчы. Падбягаць да каманды патрэбна з левага боку.

Гульня праводзіцца ў тры этапы па тры каманды. Фінальны этап – каманды-пераможцы сваіх этапаў.

**Вядучы:** У першым этапе гульні прымаюць удзел каманды: _______
Перамагла каманда ___________________________

**Вядучая:** Для другога этапа гульні запрашаюцца каманды _______
Перамагла каманда ___________________________

**Вядучы:** Трэці этап гульні. Запрашаюцца каманды _______________
Перамагла каманда __________________________________

**Вядучая:** А зараз – фінал. У фінальным этапе гульні прымаюць удзел каманды _____________________________________________________
Перамагла каманда ___________________________________________. Яна атрымлівае 1 бал.

**Вядучы:** Мы патанцавалі і пагулялі. Але пра нешта мы забыліся?

**Вядучая:** Наш народ вельмі добра спяваў. Песня нарадзілася разам з чалавекам. Калі немаўля, яшчэ толькі з'явіўшыся на свет, заплакала, яно ўжо спявала: такой была яго першая песня, якой дзіця вітала свет.

**Вядучы**: «Песня – душа народа», – сказаў у свой час наш слынны збіральнік, абаронца, прапагандыст беларускай народнай песні Рыгор Шырма. І праўда, трэба ўмець толькі ўважліва слухаць песню.

**Вядучая:** Яна як найлепш усё раскажа пра кожны народ: і хто ён такі, і як яму жывецца, і пра што ён марыць, і пра што ён думае. Плача душа народа – плача і яго песня, радуецца чалавек - адразу ж мяняецца настрой і ў песні.

**Вядучы:** Песня праз усё жыццё суправаджала беларуса. У наш час шмат якія калектывы вядуць работу па адраджэнню, захаванню і развіццю беларускай нацыянальнай традыцыйнай песеннай і абрадавай культуры.

**Вядучая:** Есць такі калектыў і ў нашым раёне. Гэта народны аўтэнтычны фальклорны ансамбль "Паршынскія зоры". Ён быў створаны пры Паршынскім сельскім клубе ў 1986 годзе. Дзякуючы ўдзельніцам калектыву ўдалося аднавіць і захаваць мноства аўтэнтычных песень, традыцый і абрадаў сваёй мясцовасці, якія знаходзіліся на мяжы знікнення і ў якіх сапраўдныя крыніцы праўдзівай беларускасці, наш арыгінальны фальклор.

**Вядучы:** На сённяшні дзень у рэпертуары калектыву больш за 200 аўтэнтычных беларускіх песень, многія з якіх не маюць "узросту", бо запісаны ад старэйшых удзельніц, якія перанялі іх ад сваіх матуль і бабуль. Песенны рэпертуар яны зберaглі і перадаюць нашчадкам у першапачатковым гучанні, захаваўшы пры гэтым цікавы мясцовы моўны дыялект. Кожная з песень мае непаўторны меладычны каларыт гучання са своеасаблівай манерай выканання, с захаваннем адметных рухаў (прытупванні і ляпанні), асабліва пры выкананні абрадавых і карагодных песень.

**Вядучая:** Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 236 ад 16 красавіка 2012 г. фальклорнаму ансамблю "Паршынскія зоры" быў нададзены статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь у катэгорыі "Спеўная традыцыя выканання хрэсьбінных і вясельных песень".

**Вядучы**: Сёння гэты калектыў падрыхтаваў для нас тэатралізаваную канцэртную праграму "Пасхальныя валачобнікі". Сустракайце, народны аўтэнтычны фальклорны ансамбль "Паршынскія зоры" Паршынскага цэнтра культуры. Кіраўнік – Любава Владыка, акампаніятар – Святлана Хутлікава.

Выступленне народнага ансамбля "Паршынскія зоры".

*(У час выступлення калектыва "Паршынскія зоры" журы падводзіць вынікі марафона).*

**ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ**

**Вядучы:** Мы даведаліся шмат новага і цікавага, добра пагулялі, патанцавалі і паспявалі, прыйшоў час падвесці вынікі этнаграфічнага марафона.

Для цэрымоніі ўзнагароджвання каманды-пераможцы і каманд-удзельніц этнаграфічнага марафона “Нам засталася спадчына” запрашаем старшыню журы, рэктара акадэміі Віталія Віктаравіча Веліканава. Вам слова, паважаны Віталій Віктаравіч.

**Вядучая:** Дыплом трэцяй ступені этнаграфічнага марафона “Нам засталася спадчына”, каштоўны і салодкі падарункі атрымлівае каманда ______________________факультэта.

**Вядучы:** Дыплом другой ступені этнаграфічнага марафона “Нам засталася спадчына”, каштоўны і салодкі падарункі атрымлівае каманда ______________________факультэта.

**Вядучая:** Пераможцам этнаграфічнага марафона “Нам засталася спадчына” стала каманда__________факультэта.

Капітану каманды ўручаецца Дыплом першай ступені, каштоўны і салодкі падарунак для ўсёй каманды.
